ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 11(1024) | АЎТОРАК, 11 чэрвеня 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ВЫЯЗНОЕ ПАСЯДЖЭННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА САВЕТА РЭКТАРАЎ

У АДНОЙ з самых маляўнічых мясцін Прысожжа, на базе пансіяната "Залатыя пяскі", што на сумежжы Беларусі і Украіны, на працягу двух дзён праходзіла выязное пасяджэнне Рэспубліканскага Савета рэктараў. У яго рабоце ўзялі ўдзел кіраўнікі як дзяржаўных, так і прыватных ВНУ краіны. Яны сабраліся для таго, каб абмеркаваць праблемы рэгіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў, выпрацаваць і прыняць адпаведныя рэкамендацыі.



## РЫНКУ ПРАЦЫ – ЗАПАТРАБАВАНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Нараду адкрыў старшыня Рэспубліканскага Савета рэктараў, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта А.В.Казулін. З віншавальным словам да яе ўдзельнікаў звярнуўся старшыня Гомельскага аблвыканкама А.С.Якабсон. Правядзенне такой сустрэчы на гомельскай зямлі, зазначыў губернатар, з'яўляецца прызнаннем тых поспехаў, якія дасягнуты рэгіёнам у развіцці адукацыі. Ён прывёў лічбы, якія характарызуюць яе высокі сучасны ўзровень. Кіраўнік вобласці запэўніў, што вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя і агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы Гомельшчыны зробяць усё магчымае для ўдасканалення падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, рэфарміравання разгалінаванай адукацыйнай сістэмы.

Надзённасць і важнасць вырашэння праблем рэгіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў падкрэсліў у сваім прывітальным выступленні міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь П.І.Брыгадзін.

З дакладам па вынесенаму на парадак дня пытанню выступіў старшыня Савета рэктараў Гомельскай вобласці, рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прафесар М.В.Селькін (**на здымку**). Ён падрабязна ахарактарызаваў стан вышэйшай школы ў рэгіёне, звярнуў увагу на яе дасягненні і адметныя прабелы. Перш за ўсё трэба пазбавіцца дубліравання ў падрыхтоўцы спецыялістаў, улічваць іх запатрабаванасць на рынку працы. Былі названы некаторыя спецыяльнасці, на якія ўжо няма попыту ад заказчыкаў. Прамоўца зазначыў таксама наспеўшую неабходнасць пераходу ВНУ рэгіёна на двухузроўневую ступень падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

З садакладамі на нарадзе выступілі рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту В.І.Сянько і рэктар Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута С.В.Жаваронак. Свае меркаванні па адной з самых актуальных праблем, ад якой у многім будзе залежыць будучыня нашай суверэннай незалежнай рэспублікі, выказалі рэктары Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава А.У.Русецкі, Беларускага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта І.М.Жарскі, Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта В.С.Башметаў і іншыя кіраўнікі ВНУ Беларусі.

На другі дзень нарады праходзілі секцыйныя пасяджэнні. Была разгорнута шырокая дыскусія не толькі па якаснаму паляпшэнню падрыхтоўкі запатрабаваных спецыялістаў, але і па многіх іншых пытаннях, ад вырашэння якіх залежыць жыццядзейнасць як кожнай ВНУ паасобку, так і ўсёй вышэйшай школы краіны ў цэлым.

Для ўдзельнікаў нарады была наладжана выстаўка навуковых і навукова-метадычных выданняў ВНУ Гомельскай вобласці, а народныя калектывы мастацкай самадзейнасці ГДУ імя Ф.Скарыны выступілі з канцэртам.

**Б.ВАЛОДЗІН.**
**Фота У.Чысціка.**

## ЗАЎТРА ВЫРАШАЕЦЦА СЁННЯ

З году ў год праводзіцца ў нашым універсітэце Дзень адкрытых дзвярэй, які ставіць сваёй мэтай з'арыентаваць юнакоў і дзяўчат у выбары будучай прафесіі. Значэнне гэтага мерапрыемства вельмі вялікае: яно дае паступаючым магчымасць рэальна ацаніць свае здольнасці, і менавіта гэта вызначае ў будучым пасяховасць студэнтаў.

Сёлета дэканат філалагічнага факультэта не абмежаваўся фармальным знаёмствам абітурыентаў з дзейнасцю і жыццём філфака. Для іх было наладжана яшчэ і невялікае свята, пад час якога студэнты першага і другога курсаў прадэманстравалі гасцям свае таленты і ўменні: у песні, танцы, а таксама прадставілі жартоўныя нумары. Такім чынам абітурыенты азнаёміліся з яшчэ адной старонкай жыцця будучых педагогаў.

Гэта пачынанне дэканата філфака было ўдалым, і будзем спадзявацца, што яно стане добрай традыцыяй.

**В.АЛІФЯРОВІЧ,**
**А.ПРОТЧАНКА,**
**студэнткі гр. Р-21 філфака.**

## "МАЛОДШЫ БРАТ" ГДУ

33 гады таму назад у Гомелі святкавалі адкрыццё другога ў рэспубліцы нашага універсітэта. Цяпер на Гомельшчыне такую назву маюць пяць ВНУ: ГДУ імя Ф.Скарыны, Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарту, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П.О.Сухога, Беларускі гандлёва-эканамічны універсітэт спажывецкай кааперацыі і Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт. Апошні з іх па выніках атэстацыі дзяржаўнай камісіі статус універсітэта атрымаў зусім нядаўна. Яго папярэднікам быў Мазырскі дзяржпедінстытут імя Н.К.Крупскай.

З нагоды знамянальнай падзеі ў Мазыры адбылося ўрачыстае пасяджэнне Савета самага маладога універсітэта, дзе яму быў уручаны адпаведны сертыфікат. Пра шляхі палескай вышэйшай навучальнай установы расказаў яе рэктар выпускнік біялагічнага факультэта нашага універсітэта, прафесар В.В.Валетаў.

З пераходам на новую якасную ступень калектыў Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта горача віншавалі начальнік упраўлення адукацыі аблвыканкама А.В. Лук'яновіч, прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, кіруючых органаў горада і раёна, госці. Ад імя нашага універсітэта цёплыя словы і пажаданні "малодшаму брату" выказаў дэкан матэматычнага факультэта дацэнт У.В. Арлоў.

## АДБЫЛІСЯ СКАРЫНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

На парадку дня майскага пасяджэння Савета нашага універсітэта першымі па традыцыі стаялі Скарынаўскія чытанні. Сёлета яны праводзіліся ў 14-ы раз. Па выніках конкурсу іх лаўрэатамі сталі кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай літаратуры, член Беларускага саюза пісьменнікаў І.М.Афанасьеў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі Г.В.Гатальская, кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры эканамічных тэорый Л.М.Крывашэева, доктар гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Р.Р.Лазько, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры Г.І.Нарскін.

Ва ўрачыстай абстаноўцы лаўрэатам Скарынаўскіх чытанняў уручаны адпаведныя дыпломы і грашовыя прэміі.

Аб падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў ва універсітэце Савету далажыў адказны сакратар прыёмнай камісіі С.А.Хахомаў.

Аб рабоце з маладымі выкладчыкамі на юрыдычным факультэце праінфармаваў яго дэкан Ю.А.Ключнікаў.

Савет зацвердзіў Палажэнне аб платным навучанні ва універсітэце.

На конкурснай аснове абраны загадчыкамі кафедр: "Фінансы і крэдыт" – доктар эканамічных навук, дацэнт Р.Я.Кобрынскі; эканамічных тэорый – кандыдат эканамічных навук, дацэнт Б.У.Сарвіраў. На пасаду старшага выкладчыка кафедры "Палітычнай сацыялогіі" абрана В.Ф.Сеніна.

Савет разгледзеў і прыняў адпаведныя рашэнні таксама па некаторых іншых пытаннях універсітэцкага жыцця.

### ДНІ МАСКВЫ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

## У ДУХУ ЯДНАННЯ СЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ

Менавіта словамі, вынесенымі ў загаловак гэтай карэспандэнцыі, можна ахарактарызаваць усе мерапрыемствы, якія праходзілі 24-25 мая г.г. у рамках правядзення дзён Паўднёва-Заходняй адміністрацыйнай акругі г.Масквы ў Гомельскай вобласці. У склад яе дэлегацыі ўваходзіла каля 200 чалавек. Гэта кіраўнікі акругі на чале з прэфектам В.Ю.Вінаградавым, грамадскія дзеячы, вучоныя, артысты, спартсмены.

У адпаведнасці з праграмай 24 мая на базе Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога адбылася сустрэча дзеячоў навукі Масквы і Гомеля. Гасцей прадстаўлялі доктар тэхнічных навук, дырэктар Інстытута машыназнаўства акадэмік РАН К.В.Фралоў, доктары навук дырэктар Інстытута прыкладной механікі імя Келдыша А.В.Забродзін, намеснік дырэктара Інстытута лесаводства М.Г.Раманоўскі, намеснік дырэктара Інстытута праблем бяспекі атамнай энергетыкі кандыдат фізіка-матэматычных навук І.І.Лінге, прафесар Г.А.Ванін. Іх гасцінна сустрэлі рэктар ГДТУ імя П.О.Сухога С.Б.Сарэла і вядучыя вучоныя гэтай ВНУ. У сустрэчы прынялі ўдзел таксама рэктар БелДУТа прафесар В.І.Сянько, прарэктар па навуковай рабоце нашага універсітэта прафесар Д.Р.Лін, прафесар БелДУТа Л.А.Сасноўскі, в.а. дырэктара ІММС імя У.А.Белага НАНБ В.М.Савіцкі, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута лесу НАНБ прафесар У.Ф.Багінскі, намеснік дырэктара Інстытута радыялогіі доктар біялагічных навук В.С.Аверын. Навукоўцы расійскай сталіцы і іх калегі з горада над Сожам абмеркавалі актуальныя праблемы па важнейшых накірунках сваёй дзейнасці.

Вялікую цікавасць выклікала выстаўка медыцынскага абсталявання і лазернай тэхнікі НВА "Полюс" (г.Масква). Яна праводзілася ў грамадска-культурным цэнтры і сумяшчалася з бізнес-сустрэчай "Праблемы і перспектывы супрацоўніцтва Гомельскай вобласці і Паўднёва-Заходняй адміністрацыйнай акругі Масквы". У гэтым мерапрыемстве ад нашага універсітэта ўдзельнічалі начальнік навукова-даследчага сектара В.Р.Сафонаў, загадчык лабараторыі лазерных тэхналогій А.Ц.Малашчанка, дацэнт кафедры радыё-фізікі і электронікі В.М.Мышкавец.

25 мая наш універсітэт наведаў генеральны дырэктар НДІ "Полюс" А.П.Казакоў. Ён азнаёміўся з лабараторыямі фізічнага факультэта. Аб напрамках іх навуковых даследаванняў, і ў першую чаргу лабараторыі лазерных тэхналогій, расказаў прарэктар па навуковай рабоце ГДУ прафесар Д.Р.Лін. Госця па-сапраўднаму зацікавілі распрацоўкі нашых фізікаў. Ён прапанаваў заключыць дагавор аб супрацоўніцтве і на пачатку аказаць дапамогу ў пастаўцы сваім будучым партнёрам неабходнай тэхнікі.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую працу, добрасумленныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны спецыяліст першай катэгорыі рэдакцыйна-выдавецкага аддзела **ЗАЙЦАВА Алена Фёдараўна** і інструктар-метадыст спартыўнага клуба **РАДЗЕВІЧ Алена Мікалаеўна.**

Конференции

# НАШИ УЧЕНЫЕ – В СЕВЕРНОЙ АФРИКЕ

В г. Марракеш (Марокко) прошла 9-ая Международная конференция по электродинамике сложных сред «Бианизотропия-2002».

Конференции по данной тематике проводятся раз в два года, и участие в них является важным условием для успешного выполнения государственных программ фундаментальных исследований. Серия этих научных форумов началась с семинаров в Хельсинки и Гомеле в 1993 году.

Нынче организаторами конференции являлись университет Пьера и Марии Кюри (Париж, Франция) и университет Кади Айяда (факультет науки и техники, Марракеш, Марокко). В ней приняло участие свыше 90 ученых из более чем 20 стран мира.

По приглашению организационного комитета в конференции участвовали сотрудники нашего университета: заведующий кафедрой общей физики, доктор физико-математических наук, профессор И.В.Семченко, доцент этой кафедры, кандидат физико-математических наук С.А.Хахомов и аспирант кафедры оптики Михаил Шуба.

Профессор И.В.Семченко выступил с докладом «Аналитическая модель искусственных спиральных сред: не каноническая, а реальная спираль». С.А.Хахомов – с совместным с И.В.Семченко докладом «Искусственные анизотропные омега структуры при наклонном падении электромагнитных волн». Учеными нашего университета были также представлены 4 стендовые доклада.

Все доклады были встречены с интересом и вниманием, о чем свидетельствовали многочисленные вопросы.

Марокко – одно из государств Магриба, занимающее крайне западную часть обширного арабского мира. Арабы называют Марокко Аль-Магриб или Аль-Магриб аль-Акса, что означает "страна дальнего Запада", европейцы - Марокко (по имени одной из ее древних столиц – Марракеш, что означает "красный" или "прекрасный"). Некогда закрытая страна в настоящее время широко распахнула двери. Государство расположено на западе Северной Африки. На Востоке и юго-востоке граничит с Алжиром, на юге - с Западной Сахарой. На Севере омывается Средиземным морем, на Западе – Атлантическим океаном. Площадь страны около 446550 кв.км, кроме того с 1979 года Марокко оккупировало территорию Западной Сахары. Население – 30 млн. человек. Мусульмане-сунниты составляют 99% населения (ислам является государственной религией Марокко), христиане – 0,8%, иудеи – 0,2%. Официальный язык в Марокко – арабский. Широко распространен французский, а на Севере в районе Танжера – испанский языки. Берберы – коренное население Марокко. В VII веке н.э. эти земли завоевали арабы, которые принесли сюда ислам. В средние века марокканцы (их также называли маврами) владели огромными территориями Северной Африки, Испании и Португалии. Они прославились как бесстрашные воины, блестящие ученые и архитекторы. На арабском языке писались священные и научные книги. Арабский язык стал научным языком, как позже латинский язык в Европе. Первый университет был организован арабами в Кордове в Испании, в XII веке возник университет в Болонье, на рубеже XII и XIII веков – в Париже, затем в других городах Западной Европы.

К XVI веку мавры были вытеснены из Европы, и Испания и Португалия начали захватывать марокканские портовые города. Несмотря на продолжительные войны, Марокко оставалось независимым государством. В XIX веке многие европейские государства пытались колонизировать эту страну. Часть ее территорий перешла к Франции и Испании. В 20-х годах нашего столетия марокканский народ начал выступать против чужеземного владычества, по стране прокатилась волна восстаний. Наконец, в 1956 году Марокко получило независимость. Столица государства – Рабат (519000 чел.). Форма правления - конституционная монархия.

Добраться до Марракеша оказалось совсем нелегко. Сначала поездом до Москвы, затем перелет Москва-Париж-Касабланка и наконец микроавтобусом до Марракеша. Путешествие заняло более 2 суток. Затем четыре напряженных рабочих дня конференции, доклады, «круглые столы», встречи, дискуссии. Был проведен обмен мнениями с ведущими мировыми учеными в области электродинамики сложных сред. Отмечена международная известность, признание и незыблемое место научной школы по оптике и акустике кристаллов, основанной в Гомельском государственном университете им.Ф.Скорины академиком Б.В.Бокутем.

Возвращение заняло такое же время – 2 суток. Прежде чем добраться до Гомеля, пришлось пересечь границы четырех государств: Марокко, Франции, России, Беларуси. Но как говорят англичане – "East or west, home is best" (В гостях – хорошо, а дома лучше).

**С.ХАХОМОВ,**
**доцент кафедры общей физики.**



**НА СНИМКЕ: гомельские ученые на экскурсии в Королевском дворце 15 века вместе с коллегами из других стран.**

# АБ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМАХ СТАГОДДЗЯ

У Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэце імя А.Д.Сахарава адбылася Міжнародная канферэнцыя "Сахараўскія чытанні 2002 года: экалагічныя праблемы XXI стагоддзя".

На яе было заяўлена 257 дакладаў. Геаграфія ўдзельнікаў вельмі шырокая: Расія, Украіна, Літва і краіны далёкага замежжа – Францыя, ЗША, Германія, Швецыя, Чэхія – усяго 11 краін. У канферэнцыі прынялі ўдзел і прадстаўнікі нашага універсітэта – геолага-геаграфічнага (у тым ліку і аўтар гэтых радкоў) і біялагічнага факультэтаў.

Спектр прадстаўленых дакладаў быў вельмі шырокім. Усяго працавала 4 секцыі: "Сацыяльна-экалагічная праблематыка ў рэчышчы гуманістычных ідэй Сахарава", "Медыцынская экалогія. Малекулярная медыцына", "Экалогія. Радыеэкалогія. Экалагічны маніторынг. Экалагічныя інфармацыйныя сістэмы. Экапрыярытэтная энергетыка", "Экабіялогія".

Большасць дакладаў краналіся ўздзеяння радыяцыі на арганізм чалавека, аб'екты расліннага і жывёльнага свету. Аб цікавасці да дадзенай тэмы сведчыць і актыўны ўдзел у канферэнцыі замежных дэлегатаў, і той факт, што працэс абмеркавання дакладаў праходзіў настолькі бурна, што старшыні зрэдку даводзілася нават заклікаць удзельнікаў да стрыманасці.

Прагучаўшыя выступленні далі магчымасць вучоным розных краін абмяняцца вынікамі сваіх даследаванняў, што, безумоўна, надасць новы імпульс развіццю экалагічнай навукі як у нашай краіне, так і за яе межамі.

**А.САКАЛОЎ,**
**студэнт гр. ЭК-21 геолага-геаграфічнага факультэта.**

# УСХВАЛЯВАЎ ДУШУ СКАРЫНА

У рамках праведзенай на базе ГДУ Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Скарына і наш час" адбылася прэзентацыя надрукаванай у выдавецтве "Беларускі кнігазбор" кнігі Дональда Кодара "Мой Францыск Скарына". Аўтарам гэтага твора з'яўляецца не пісьменнік або літаратуразнаўца, а звычайны амерыканскі хірург, які ў 1997 г. прыехаў з дабрачыннай місіяй на Беларусь. Менавіта тады спадар Кодар упершыню пачуў імя Францыска Скарыны і зацікавіўся ім. Зацікавіўся, як сказаў ён сам, таму, што беларускі першадрукар здолеў ускалыхнуць штосьці ў яго душы, таму, што Скарына хвалюе сэрцы людзей не толькі на Беларусі, але і ва ўсім свеце нават зараз праз стагоддзі.

Мерапрыемства распачаў Кастусь Усовіч, загадчык музея-лабараторыі Францыска Скарыны. Ён прадставіў прысутным шаноўнага госця, пасля чаго студэнтка гр. БА-23 М.Страха расказала аб сваіх уражаннях аб прачытанай кнізе, выказала цікавае меркаванне, што постаць асветніка нясе ў сабе аб'ядноўчую ідэю для беларускага народа.

З падзякамі амерыканскаму хірургу за даследаванне дзейнасці нашага славутага земляка выступіла загадчыца кафедры беларускай мовы ГДУ прафесар А.А.Станкевіч. І, нарэшце, чарга звярнуцца да аўдыторыі надышла самому доктару Дональду. Ён расказаў аб тым, што яго натхніла на стварэнне "Майго Францыска Скарыны", што вельмі добра ставіцца да Беларусі цалкам, што ў беларусаў як нацыі ёсць будучыня і ў ёй заключана нейкая моц. Шаноўны госць адказаў на пытанні студэнтаў I курса філалагічнага факультэта. Найбольш цікавым можна лічыць наступнае: "Ці значна адрозніваецца моладзь беларуская ад амерыканскай?". На гэта Кодар адказаў так: "Беларускія маладыя людзі ў плане маралі падабаюцца мне больш за амерыканскіх. А на знешні выгляд у прынцыпе ніякай розніцы няма, толькі скура белая".

Сустрэча атрымалася надзвычай жывой і цікавай, шкада толькі, што кніга "Мой Францыск Скарына" ў Амерыцы, дзе па словах самога аўтара пра беларускага першадрукара ніхто нічога не ведае, распаўсюджвацца не будзе.

**Наталля СТАРЧАНКА,**
**студэнтка гр.БЖ-12 філалагічнага факультэта.**

# ПРАЦУЕ МІЖКАФЕДРАЛЬНЫ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ СЕМІНАР

Аналізуючы і падводзячы вынікі работы метадычнага семінара філалагічнага факультэта, трэба зыходзіць з такіх паказчыкаў, як актуальнасць і якасць выступленняў, іх сувязь з вучэбным працэсам, наведваемасць семінара выкладчыкамі, перспектыўнасць тэматыкі і г.д.

За апошнія два гады на навукова-метадычных семінарах выступілі многія вядучыя выкладчыкі нашага факультэта. Глыбокія і запамінальныя даклады зрабілі прафесары, доктары навук У.І.Коваль "Сінанімія і антанімія міфалагем", А.А.Станкевіч "Асновы лектарскага майстэрства", Р.М.Казлова "Этымалогія як аснова філалагічнай адукацыі", І.Ф.Штэйнер "Трагічнае светаадчуванне малых народаў". Надзённым праблемам развіцця сучаснай літаратуры былі прысвечаны выступленні крытыкаў і літаратуразнаўцаў І.М.Афанасьева "Трагізм чарнобыльскага светаадчування", В.К.Шынкарэнка "Калі пісьменніку баліць...". Сінтэтычным, абагульняючым розныя галіны ведаў было слова Л.Ф.Кахоўскай "Асновы псіхалінгвістыкі" і В.А. Адзіночанкі "Жанчына як феномен быцця".

Паглыбленае асвятленне праблем, актуальных для прафесійнай дзейнасці выкладчыкаў-філолагаў, далі на семінарскіх занятках кандыдат псіхалагічных навук Г.В.Гатальская – "Вырашэнне псіхалагічнага канфлікту", дырэктар Веткаўскага музея народнай творчасці Г.Г.Нячаева – "Культуралагічны аспект вывучэння іканаграфіі". Філасофскі погляд на тэмы інтэрпрэтацыі тэксту і сучасных праблем герменеўтыкі, якія цікавяць філолагаў, змяшчалі выступленні выкладчыка кафедры філасофіі В.М.Галкіна.

На метадычны семінар запрашаюцца і работнікі бібліятэкі. Так, заг. аддзела абслугоўвання Л.К.Сальнікава і заг. аддзела камплектавання Н.У.Чарачкіна не толькі пазнаёмілі філолагаў з новымі паступленнямі ў кніжны фонд, але і з болем у сэрцы прадэманстравалі ўзоры варварскіх адносін чытачоў да каштоўных кніг.

На семінар выносяцца і такія востраактуальныя пытанні, як каардынацыя кафедр універсітэта ў правядзенні педагагічнай практыкі. Сумеснае абмеркаванне іх педагогамі, псіхолагамі і філолагамі, як паказаў вопыт, аказалася выніковым і выявіла шмат новых праблем.

У арганізацыі і правядзенні семінараў актыўны ўдзел прымаюць члены метадычнага савета факультэта: Т.М.Багаедава, А.М.Краснова, І.І.Марозава. Для ўдасканалення работы імі прапанавана сінхроннае ўключэнне семінарскіх заняткаў у маштабныя факультэцкія мерапрыемствы, напрыклад, "Тыдзень творчасці Ф.І.Дастаеўскага". У верасні 2002 года тэма семінара будзе прымеркавана да навукова-метадычных чытанняў "Слова і час", прысвечаных памяці заг. кафедры рускай літаратуры У.М.Сабаленкі.

Работа семінара знаходзіцца пад пастаянным кантролем дэкана факультэта У.А.Бобрыка і нам. дэкана Л.П.Кузьміча. Іх невялікія, але ёмістыя паведамленні дазваляюць аператыўна данесці бягучую інфармацыю па пытаннях вучэбнага працэсу да ўсіх прысутных на семінары выкладчыкаў.

Падвядзенне вынікаў нам здалося неабходным, каб аб'ектыўна ацаніць зробленае, выявіць недахопы, і, можа, зацікавіць тых выкладчыкаў, каго мала датычылася ўся зробленая намі работа.

**Н.КАПШАЙ,**
**старшыня метадычнага савета філалагічнага факультэта.**

СУСТРЭЧЫ

# ...КАБ УСПОМНІЦЬ СВАЮ МАЛАДОСЦЬ

У студэнтаў-філолагаў 1, 4 курсаў адбылася цікавая сустрэча з былым выпускніком нашага універсітэта, цяпер к.ф.н. А.Ю.Лозкам. Скончыўшы вучобу ў ГДУ, Алесь Юр'евіч працаваў настаўнікам і дырэктарам сярэдняй школы, займаўся фалькларыстыкай; з часам заняў пасаду дырэктара Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра "Гульні і цацкі". Цяпер ён працуе выкладчыкам на факультэце вуснай народнай творчасці ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М.Танка. А.Ю.Лозка – аўтар каля 10 кніг па фалькларыстыцы, сярод іх – "Беларускі народны каляндар", "Беларуская батлейка", цыкл "Святы", "Матэматычны фальклор".

Наш госць пазнаёміў нас з асаблівасцямі вучэбнага працэсу на сваім факультэце. Гэта адносна маладое аддзяленне, якое рыхтуе мастакоў, кіраўнікоў школьных мастацкіх калектываў, арганізатараў спартыўных мерапрыемстваў. Студэнты-фалькларысты жывуць у неардынарнай краіне мастацтва, якую самі ствараюць.

Не абыйшлі нашу сустрэчу і хвіліны настальгіі. Алесь Юр'евіч дзяліўся з намі сваімі ўспамінамі: "Я прыйшоў да вас, каб успомніць сваю маладосць", – гэтыя словы ўразілі нас. Пэўна, у кожнага з прысутных (а асабліва ў чацвёртакурснікаў) прамільгнула думка аб тым, што ўсё праходзіць: і маладосць, бесклапотныя мары, незабыўныя сустрэчы – усё тое, што называецца студэнцкім жыццём.

Столькі знакамітых добрых людзей правялі свае лепшыя гады ў нашай alma-mater! І сёння мы ганарымся імі.

**Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ,**
**студэнтка гр.РБ-43 філалагічнага факультэта.**

# ПРЫЗЁРЫ АЛІМПІЯДЫ

У г.Гродна прайшла адкрытая міжвузаўская алімпіяда сярод студэнтаў юрыдычных факультэтаў, у якой прынялі ўдзел студэнты ўсіх вядучых ВНУ краіны. Каманда юрыдычнага факультэта нашага універсітэта пад кіраўніцтвам асістэнта кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Т.Г.Краўчанка таксама ўдзельнічала ў алімпіядзе.

Алімпіяда праводзілася па наступных дысцыплінах: "Тэорыя дзяржавы і права", "Канстытуцыйнае права", "Крымінальнае права", "Грамадзянскае права".

Студэнты юрыдычнага факультэта нашага універсітэта В.Брылёва, П.Рэп'еўскі, І.Пярэрва, Д.Міхайлаў, К.Дзецяроў, Д.Кузянёк, М.Лабушаў занялі III-е прызавое месца ў камандным заліку, уступіўшы Гродзенскаму дзяржуніверсітэту імя Я.Купалы і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У індывідуальным заліку III-е месца заняла студэнка 5 курса Вераніка Брылёва.

***Рабочая, учебно-трудовая неделя, день за днем – привычный режим. Но вот наступают выходные – время отдыха и развлечений, и каждый раз накануне очередного уик-энда, желая сбросить груз накопившихся за неделю хлопот, мы все мечтаем окунуться в атмосферу пусть и кратковременного, но беззаботного праздника. Чем же себя занять, где получить заряд бодрости и вдохновения для души и одновременно пищу для интеллекта? Дискотеки – для малолеток, да и музыка тамошняя давит на слуховой аппарат непомерным уровнем децибеллов; кино потеряло свою актуальность; ресторан не вписывается ни в бюджет, ни в требуемый уровень общения... Театр? Нынче туда попасть непросто – билеты надо покупать заранее: велик спрос у наших сограждан на этот древний и постоянно обновляющийся вид искусства.***



# А ЧТО ТАМ, ЗА КУЛИСАМИ?

**(эксклюзивное интервью для газеты «Гомельскі ўніверсітэт»)**

Театр – это целый мир, многоликий, загадочный, волшебный.

А если пойти в театр... на занятия? Да, да! Не ищите грамматической ошибки в выборе окончания! Именно на занятия, вместо привычных и за пять студенческих лет слегка наскучивших аудиторных лекций и практических в университете взять да и заглянуть за кулисы театра!

Удивлены? Напрасно! Такие занятия очень даже возможны... благодаря необычному новому спецкурсу «Современная драматургия и театр», в рамках которого запланированы разнообразные лекционные и практические занятия непосредственно в здании заслуженного коллектива РБ Гомельского областного драматического театра.

Все мы, филологи группы РБ-53, шли в театр в будний день с некоторым волнением в душе: что ждет нас там, за кулисами, какая тайна сокрыта от глаз ничего не подозревающего зрителя? А там... Тайное тайных актерского имиджа, кузницы сценических образов знакомых по драматургическим произведениям персонажей: реквизитная, гримерная, парикмахерская, костюмерная; узкие лестницы, повороты, переходы, сцена «с той стороны»... Весь этот чудесный мир театральной «изнанки» нам показала удивительная и страстная служительница Мельпомены Людмила Ивановна Алещенко, которая уже много лет работает актрисой в нашем театре. «Работает»! Как банально-буднично звучит это слово, кажется, совсем не подходящее для профессии актера! Но это – работа, столь же напряженная, ответственная и интересная, как и любая другая, например, из сферы педагогических профессий.

Для Людмилы Ивановны, заведующей литературной частью театра, педагога-наставника молодых актеров и студийцев, встречи с общественностью – привычное дело, непосредственно касающееся ее профессионального мастерства.

Входим в малый зал, тот, что в рекреации второго этажа, за большим черным роялем. Людмила Ивановна удобно-артистично усаживается в кресло, стоящее на сцене, а мы располагаемся в небольшом уютном зрительном зале. Начинается разговор.

*– Людмила Ивановна, как проходит рабочий день актера?*

– Как обычно, в 11.00 начинается репетиция, на которую все занятые в вечернем спектакле актеры приходят уже в гриме и в костюмах. С 14.00 до 16.00 – обеденный перерыв, время, когда можно отдохнуть и перекусить. Но многие предпочитают оставаться в этот период в стенах театра, подпитываясь бутербродами и горячим чай-кофе из термоса, ведь с 16.00 – 17.00 – снова репетиция. Так день проходит – профессия!..

*– Есть ли у актеров отгулы, можно ли взять больничный?*

– Отгулов у нас нет. Что же касается больничного – отыграй спектакль, а потом болей себе на здоровье. Кто-то не выдерживает такого напряженного жизненного графика, а раз не можешь – ищи другую работу. Да, это очень жестокая профессия: лишь для непосвященных и зрителей театр – вечный праздник.

*– Когда же актеры живут для себя? Находят ли они время для личной жизни?*

– При таком распорядке времени на личную жизнь, как вы сами понимаете, почти не остается. Большая нагрузка по домашним хлопотам ложится на супругов-нетеатралов. В этом случае для сохранения брака очень важны настоящая любовь и взаимопонимание. В нашей профессии много одиноких людей, не нашедших времени для создания полноценной семьи. Однако есть и театральные семейные пары. Вот, например, Виталий Бедношея и Евгения Конькова, Алексей Бычков и Наталия Задорина, Андрей Карако и Виолетта Сарвирова, Владислав и Кристина Карако – все они познакомились в театре, а затем поженились.

*– Многие приходят в театр на пробы своего актерского таланта?*

– Очень многие, но немногие остаются из-за маленькой зарплаты, отсутствия квартирного фонда. Есть и другие причины, они кроются в особенности нашей профессии, которая требует отличного здоровья, подвижной психики и хороших внешних данных.

*– Можно ли «программировать» успех того или иного спектакля у зрителя?*

– Можно, хотя и сложно. Успех спектакля зависит прежде всего от игры актеров, поэтому необходимо правильно подобрать актера на роль. Это очень хорошо удается режиссеру Валерию Раевскому. Кроме того, мы производим очень строгий отбор пьес и приглашаемых для работы над постановкой режиссеров (своих режиссеров у нас, к сожалению, нет). Директор театра и председатель худсовета Валентина Георгиевна Роговская старается открывать новые имена в драматургии и приглашать к нам на постановку лучших режиссеров Беларуси, Украины, России.

*– Не секрет, что в речи актеров, играющих спектакли на белорусском языке, встречаются ошибки в произношении, акцентуации белорусских слов. Кто работает над речью актеров?*

– Действительно, не все наши актеры владеют правильным русским произношением, многие не знают белорусского языка. Это одна из серьезных проблем всех наших театров. К сожалению, не всегда имеются деньги, чтобы пригласить квалифицированного репетитора. Вот если бы можно было организовать бесплатные курсы белорусского языка, мы были бы признательны участникам такой волонтерской акции и с удовольствием занимались бы, повышая уровень произношения и владения белорусским языком в целом.

*– Сколько обычно готовится спектакль?*

– На подготовку нового взрослого спектакля уходит, как правило, два – два с половиной месяца.

*– Есть ли в современном театре суфлеры?*

– Суфлерская профессия отошла в прошлое. Если актер в чем-то неуверен, то по его личной просьбе помощник режиссера может «подать» текст из-за кулис, например, если у актера срочный ввод на роль.

*– Применяете ли Вы в жизни свои актерские способности?*

– А как же! В семье, например, слезы, истерику в нужный момент мужу закатить.

*– Людмила Ивановна, как Вы относитесь к своей профессии? Если бы Вам пришлось начинать жизнь заново, стали бы Вы актрисой?*

– Кто заболел театром, заболел им навсегда. Театр – это образ жизни, который очень трудно изменить. Если бы сейчас мне сказали, что у меня будет отдельный кабинет, определенный режим работы с фиксированным обеденным перерывом, выходными и другими «удобствами», я бы тотчас повесилась. Бухгалтером, во всяком случае, точно не смогла бы работать: усидеть и каждый день перекладывать с места на место разные бумажки – это не для меня. Я люблю, когда все меняется, движется. Мне нравится разнообразие. Возможно, я смогла бы стать педагогом – иногда так хочется передать свои знания и опыт...

*– А что же есть необычного в театре?*

– В театре все будничное необычно: репетиции, спектакли, зрители – все это работа, трудная, но интересная, тем она и необычна. Вот, пожалуй, из сферы необычного: в нашем театре живет... Привидение, многие утверждают, что видели его, некоторые даже слышали. А что, вполне возможно, что это Дух нашего театра, добрый хранитель традиций. Вообще театр – живое существо, которое может помогать тебе или быть тобою недовольно. Я верю, что в театре живут души уже ушедших талантливых актеров, опекающие нас. Я очень люблю ночную сцену, когда в зале никого нет и я одна с этим живым существом – Театром с большой буквы.

*– Получается, что актеры – люди суеверные?*

– Возможно. Во всяком случае почти у каждого актера есть свой талисман. У меня, например, вот этот серебряный перстень с янтарем. Ему уже тридцать лет. Если он со мной – спектакль для меня проходит успешно, если я случайно забываю его дома, то плохо играю.

Вот такая беседа получилась у нас с Людмилой Ивановной Алещенко. Сказать, что нам очень понравилось общение с актрисой, значит, ничего не сказать. Мы были не просто увлечены беседой – мы были очарованы. С помощью Людмилы Ивановны мы чуть-чуть приблизились к тайне, живущей за кулисами. Но разгадать эту тайну до конца невозможно: театр всегда будет загадкой, манящей, многогранной и непостоянной, как сама наша жизнь. А пока – пойдемте на спектакль!

... И снова медленно гаснет свет в зрительном зале, постепенно смолкает говор публики, поднимается занавес – и мы уже в другой жизни, где каждый из нас ощущает себя каким-то персонажем этого загадочного и непредсказуемого мира...

**Елена КАЦУРА,**
**от имени группы РБ-53**
**филологический факультет.**

<u>Спорт</u>



## КУБАК ЗАСТАЕЦЦА Ў ГОМЕЛІ

У Віцебску прайшлі спаборніцтвы за Кубак Беларусі па валейболу сярод мужчынскіх каманд. У фінале сустрэліся мінулагоднія ўладальнікі Кубка – "Гомельскі валейбольны клуб", за які, дарэчы, гуляюць нашы студэнты, і сёлетнія чэмпіёны Беларусі – "Камунальнік" з Гродна. Гамяльчане перамаглі з лікам 3:1, заваяваўшы другі год запар Кубак краіны.

◆ ◆ ◆

## З ВЫНІКАМІ МАЙСТРОЎ СПОРТУ

У праграме Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў прайшлі спаборніцтвы па плаванню.

У нашай камандзе восем студэнтаў станавіліся пераможцамі на розных дыстанцыях і ў эстафетным плаванні.

Уладзімір Катлоўскі (5 курс), Мікалай Ганчароў (2 курс), Станіслаў Невяроўскі (2 курс) – усе з факультэта фізічнай культуры і Вольга Мірашнічэнка – студэнтка-завочніца філалагічнага факультэта на ўсіх дыстанцыях паказалі нарматывы "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь"

У агульнакамандным заліку перамаглі студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры. Нашы плыўцы былі другімі.

◆ ◆ ◆

## СЯРЭБРАНЫ ФІНІШ

У фінальных спаборніцтвах сярод жаночых гандбольных каманд у праграме XII-х Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў за ўзнагароды спрэчку вялі шэсць дружын ВНУ краіны. У выніку перамагла каманда Беларускай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры. Нашы студэнткі заваявалі сярэбраныя медалі. На трэцім месцы – Гродзенскі дзяржуніверсітэт.

◆ ◆ ◆

## ЗНОЎ У ПРЫЗЁРАХ

Рэспубліканскія спаборніцтвы па грэка-рымскай барацьбе, якія ўваходзяць у праграму студэнцкіх гульняў, прайшлі ў г.Маладзечна. Галоўны прыз дастаўся Беларускай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры. Другімі прызёрамі сталі спартсмены Гродзенскага дзяржуніверсітэта, а замкнулі тройку мацнейшых барцы нашага ўніверсітэта.

Другакурснік факультэта фізічнай культуры майстар спорту Юрый Каляснёў (66 кг) узняўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. Студэнт першага курса гэтага ж факультэта Аляксандр Крышнёў (84 кг) заваяваў сярэбраную ўзнагароду.

Нельга не адзначыць адну знамянальную дату. Сёлета ў верасні споўніцца 50 гадоў, як у нашай ВНУ на кафедры фізічнага выхавання і спорту працуе майстар спорту СССР С.М.Дзегцяроў, і ўвесь гэты час ён з'яўляецца галоўным трэнерам па грэка-рымскай барацьбе. Яго выхаванцамі сталі дзесяткі майстроў спорту, якія з поспехам выступалі на самых разнастайных спаборніцтвах у нашай краіне і ў замежжы.

**В. МАРЧАНКА.**

<u>Гэта вас зацікавіць</u>

# ЦІ ПАДНІМЕЦЦА ПЕНСІЙНАЯ ПЛАНКА?

***Многіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта, як і ўсіх сталых грамадзян Рэспублікі Беларусь, цікавяць палажэнні, закладзеныя ў праект Закона "Аб дзяржаўным пенсійным страхаванні і дзяржаўных страхавых пенсіях". Агульную сітуацыю і, у прыватнасці, арт. 19 аб узроставым цэнзе для атрымання дзяржаўнай пенсіі каменціруе галоўны спецыяліст юрыдычнага аддзела Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай Я.С.Трушчанка.***

Адна з асаблівасцей праекта вышэйназванага закона – павышэнне ўзроставага цэнзу, які прадугледжвае павелічэнне пенсійнага ўзросту на працягу 10 год штогод на 3 месяцы для мужчын да дасягнення імі 62 з паловай гадоў і на 6 месяцаў штогод для жанчын да дасягнення імі ўзросту 60 гадоў. Усё гэта абумоўлена дэмаграфічным становішчам. Сёння 17 працуючых "кормяць" 10 пенсіянераў, а ў 2003-2005 гадах гэтыя суадносіны яшчэ больш зблізяцца. Каб не дапусціць такога абвалу і прынята рашэнне скараціць колькасць пенсіянераў за кошт прадаўжэння працоўнай дзейнасці. Акрамя гэтага, у законапраекце прадугледжана няпоўная выплата пенсіянерам належнай сумы. Выклікаюць пытанні і прапануемыя ўмовы назначэння пенсіі.

УЗРОСТАВЫЯ РАМКІ ДЛЯ НАЗНАЧЭННЯ ПЕНСІІ

**Для мужчын**

нарадзіўшыхся да 1943 года – 60 гадоў;
нарадзіўшыхся ў 1943 годзе – 60 гадоў і 3 месяцы;
нарадзіўшыхся ў 1944 годзе – 60 гадоў і 6 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1945 годзе – 60 гадоў і 9 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1946 годзе – 61 год;
нарадзіўшыхся ў 1947 годзе – 61 год і 3 месяцы;
нарадзіўшыхся ў 1948 годзе – 61 год і 6 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1949 годзе – 61 год і 9 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1950 годзе – 62 гады;
нарадзіўшыхся ў 1951 годзе – 62 гады і 3 месяцы;
нарадзіўшыхся ў 1952 годзе і пазней – 62 гады і 6 месяцаў.

**Для жанчын**

нарадзіўшыхся да 1948 года – 55 гадоў;
нарадзіўшыхся ў 1948 годзе – 55 гадоў і 6 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1949 годзе – 56 гадоў;
нарадзіўшыхся ў 1950 годзе – 56 гадоў і 6 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1951 годзе – 57 гадоў;
нарадзіўшыхся ў 1952 годзе – 57 гадоў і 6 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1953 годзе – 58 гадоў;
нарадзіўшыхся ў 1954 годзе – 58 гадоў і 6 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1955 годзе – 59 гадоў;
нарадзіўшыхся ў 1956 годзе – 59 гадоў і 6 месяцаў;
нарадзіўшыхся ў 1957 годзе і пазней – 60 гадоў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 273.
Падпісана да друку 07.06.2002 г.